ТЭЛЕПРАГРАМА НА НАСТУПНЫ ТЫДЗЕНЬ – на 3-й старонцы

Свабода, роўнасць, братэрства!

Беларускі Ўсход

ЖЫВЕ БЕЛАРУСЬ!

НАЦЫЯНАЛЬНАЯ ДЭМАКРАТЫЧНАЯ ГАЗЕТА

● Заснавана ў 1991 годзе ● № 7 (140) ● Чацвер, 15 лютага 2001 г. ● У розніцу кошт свабодны

НАВІНЫ. ПАДЗЕІ. ФАКТЫ

ІНЖЫНЕР-РАСТРАТЧЫК

Супрацоўнікі ўпраўлення Следчага камітэта Магілёўскай вобласці ўстанавілі, што інжынер ААТ "Магілёўскі электрамеханічны завод" шляхам растраты ў снежні мінулага года завалодаў маёмасцю прадпрыемства на 930 тысяч рублёў.

У ходзе расследавання матэрыяльны ўрон заводу быў поўнасцю кампенсаваны. І ў дадатак накладзены арышт на маёмасць абвінавачваемага на суму 940 тысяч рублёў.

Ігар ГРЫШЫН.

КОЛЬКІ ТРЭБА ГРОШАЙ, КАБ ПРАКАРМІЦЦА

Паводле даных прафсаюзаў, "харчовы кошык" у студзені заўважна падаражэў у параўнанні са снежнем мінулага года. У студзені для нармальнага харчавання на аднаго чалавека ў месяц трэба было патраціць у сярэднім па краіне 31347 рублёў, у Брэсце — 28052 рублі, у Віцебску — 28015 рублёў, у Гродне — 29667 рублёў, у Магілёве — 30321 рубель, у Гомелі — 31569 рублёў, а ў Мінску ажно 40351 рубель. Цяпер, дарагія чытачы, падлічыце свае сямейныя даходы за мінулы месяц і параўнайце, які даход у вас прыпадае на аднаго члена сям'і і колькі ў вас заставалася б грошай на іншыя патрэбы, калі б вы нармальна харчаваліся. Думаю, у большасці з вас не хапіла б нават на харчаванне ў такім разе. І калі вы нешта яшчэ з рэчаў сумелі купіць, то не інакш, як за кошт эканоміі на харчаванні, а гэта значыць — на сваім здароўі.

Наш кар.

"ЖЫВАЯ КАНТРАБАНДА" ПРАЗ МЯЖУ НЕ ПРАЙШЛА

Пагранічнікі Лідскага атрада спынілі даволі рэдкую спробу кантрабанды.

Як паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе Дзяржаўнага камітэта памежных войскаў, 29 студзеня ў раёне населенага пункта Даўгерадзішкі былі заўважаны двое невядомых. Як высветлілася, яны спрабавалі перагнаць праз мяжу... быка і пяць кароў. Аднак, заўважыўшы памежнікаў, "даглядчыкі жывёлы" зніклі на тэрыторыі Літвы. "Жывая кантрабанда вагой больш як дзве тоны перададзена мытным службам. Яна ацэнена ў 1 мільён 158 тысяч рублёў.

Ігар ХАДАСЕВІЧ.

ЭЛЕКТРАЭНЕРГІЯ ПАДАРАЖЭЛА

З 1 лютага змяніліся тарыфы на электраэнергію. Цяпер гарадское насельніцтва будзе плаціць за кожную кВт/гадзіну 17,4 рубля, а жыхары дамоў, якія абсталяваны электрапліта-мі 12,6 рубля. Столькі ж будуць плаціць цяпер і вясковыя жыхары.

Наш кар.

У МСЦІСЛАВЕ ЗГАРЭЛІ ДЗЕЦІ

31 студзеня двое дзяцей загінулі ў час пажару ў Мсціславе. Загаранне ў жылым доме на вуліцы Камунарнай адбылося ўдзень. Дзеці знаходзіліся ў пакоі, а бацькі ў гэты час адправіліся ў магазін, закрыўшы кватэру на замок.

Першымі загаранне ў кватэры выявілі суседзі. Адчуўшы пах дыму і ведаючы, што ў кватэры знаходзяцца дзеці, суседзі паспрабавалі прабіцца туды. Аднак пранікнуць у палаючае памяшканне так і не ўдалося. Пасля таго, як былі выбіты вокны і дзверы, у кватэру пачаў паступаць кісларод, а высокая тэмпература ў самой кватэры садзейнічала ўзмацненню агню. У такіх умовах, зразумела, суседзям дзяцей выратаваць не ўдалося.

Кірыл ДАНІЛАЎ.

СВІНЕЙ УКРАЛІ ЦЭЛЫ СТАТАК

Мсціслаўская міліцыя затрымала ў дарозе цэлую аўтамашыну ўкрадзеных свіней. У кузаве грузавіка былі 23 свінні агульнай вагой 3305 кілаграмаў. На палову гэтай жывёлы была афармлена "ліпавая" накладная. Везлі свіней для такой жа не існуючай фірмы атрамальніка. Як паведаміў начальнік Мсціслаўскага РАУС Уладзімір Князеў, усё гэта пагалоўе было загружана на свінакомплексе "Віхра" Мсціслаўскага раёна. Адпусцілі жывёлу два начальнікі цэхаў за хабар у тысячу долараў ЗША. Гэта афера прыкрывалася як разлік за атрыманы мазут з Крычаўскай ЖКГ. Але, як высветлілася, паліва гэта таксама было ўкрадзена. Словам, цэлы клубок злачынстваў, які цяпер разматваецца следствам. Ну а канфіскаваныя свінні перададзены Мсціслаўскай раённай нарыхтоўчай канторы для рэалізацыі.

БЕЛТА.

Салісткі.

Фота Валерыя БЫСАВА.

ЗАТРЫМАНЫ ГАНДЛЯР ВЫБУХОВЫМ РЭЧЫВАМ

Супрацоўнікам упраўлення КДБ Гомельскай вобласці ў Мазыры пры спробе збыту 3 кілаграмаў тратылу затрыманы жыхар Калінкавіцкага раёна. Пра гэта БелаПАН паведамілі ў прэс-службе ведамства.

Падчас следства высветлілася, што да гэтага бізнесу маюць дачыненне яшчэ двое жыхароў Светлагорска. У гаражы аднаго з іх знойдзены цэлы арсенал зброі і боепрыпасаў часоў другой сусветнай вайны... Так, знойдзена 5 мінамётных мін, 5 гранат Ф-І, трохлітровая ёмістасць з порахам, самаробны абрэз, 11 стваloў наразной зброі і больш за 800 патронаў.

Па гэтаму факту ўзбуджана крымінальная справа за незаконнае захоўванне зброі.

Ірына ШАНЦАВА, БелаПАН.

● *Інтэлектуальны ўзровень кіраўніка*

ПЕРАПУД У САЎГАСЕ

У сераду 31 студзеня а другой палове дня прыехалі з Мінска ў рэдакцыю спецыялісты для устаноўкі і наладкі тут электроннай пошты. У аднаго з іх быў лічбавы фотаапарат. Той спытаў у мяне:

— Мо тут ёсць што сфатаграфаваць? Я б вам для газеты здымкі зрабіў...

— Ды вунь побач ферма па адкорму бычкоў. Зараз там якраз павінны корм жывёле закладваць. Калі ласка, зрабіце здымкі гэтага працэсу, ну і партрэтныя здымкі жывёлаводаў. Буду вам удзячны, — сказаў я.

І Сяргей, фатограф, разам з шафёрам накіраваліся на ферму, а мы з другім таварышам узяліся за ўстаноўку апаратуры.

На ферме аказалася цэлая плойма нейкіх камерсантаў. Яны забілі пяць бычкоў і патрашылі іх. Як толькі здалёк заўважылі падыходзячых "не сваіх", трое з нарыхтоўшчыкаў мяса кінулі ў сані мяшок з нечым, самі селі туды і — пугай па каню. Шпарка паімчалі прэч ад фермы. Чаго яны спалохаліся? Гэта насцярожыла Сяргея і ён пачаў здымаць тых, што не кінуліся на ўцёкі і займаліся сваёй справай. Яны ж пачалі ўпрошваць Сяргея не фатаграфаваць, нават спрабавалі "прагнаць" яго. Сяргея ж гэта яшчэ больш раззадорыла і ён зрабіў цэлы шэраг здымкаў.

Вярнуўшыся ў рэдакцыю, ён гаворыць:

— Што за дзіва, патрошаць бычкоў і нечага баяцца, не хочуць, каб я здымаў іх за гэтым заняткам. Відаць, тут штосьці не так, незаконна. Вы не ведаеце?

— Як тут, — кажу, — вызначыць, законна ці не? Справа ў тым, што пры здачы бычкоў на мясакамбінат грошы на разліковы рахунак саўгаса паступаюць вельмі не хутка. А калі і паступяць, то саўгасу іх не атрымаць — грошы пойдуць на пакрыццё даўгоў, якіх у саўгасе больш чым няма куды.

Калі ж бычкоў зарэжуць камерсанты з Расіі, ды хоць і свае, то ў саўгасную касу паступяць "жывыя" грошы ў гэты ж дзень. Значыць, хтонікто зможа атрымаць зарплату, можна будзе купіць паліва, хаця б для легкавушкі дырэктара. Ды і нейкія запчасткі для саўгаснай тэхнікі прыдбаць. Так што з пункту гледжання саўгаса гэта —нармальная з'ява. Гэта і лагічна нават. Калі ж меркаваць па-дзяржаўнаму, то гэта — не нармальна, калі не злоўжыванне.

— Дык тут жа менавіта і магчымы злоўжыванні, — кажа Сяргей. — Хто кольвечы і "рукі заскабіць" можа. Ці не так?

— Гэта ўжо іншае пытанне. Тут залежыць усё ад сумлення ўдзельнікаў гандлёвай здзелкі. З гэтым хай разбіраюцца праваахоўныя органы, — кажу я.

Аб здарэнні загадчыца фермы хуценька паведаміла дырэктару саўгаса "Трасціно". І той неўзабаве з'явіўся. Праязджаючы міма рэдакцыі на хуткасці пешахода, усё прыглядваўся да "іншамаркі", што стаяла тут, з мінскім нумарам. У рэдакцыю ж зайсці "пасаромеўся".

Загадчыца фермы ўявіла ў вушы свайму "начальніку", што "ва ўсім вінаватая Ленка, даглядчыца бычкоў", бо яна "сказала свайму мужу, што сёння будуць біць пяцярых бычкоў, а той перадаў рэдактару тутэйшай газеты, а рэдактар патэлефанаваў у Мінск і выклікаў карэспандэнтаў". І тыя, бачыце, хуценька прыехалі і якраз у самы разгар забойства жывёлы. Вось як апаратыўна працуюць журналісты! Гэтыя "ворагі" вытворцаў сельгаспрадукцыі? І ва ўсім вінаваты гэты рэдактар "Беларускага Ўсходу", у якога такія сувязі, што па яго выкліку за якіх 4-5 гадзін прыязджаюць сталічныя фотакарэспандэнты. Калі б не гэты праклятый рэдактар, "гэтага б нічога не было".

Дырэктар саўгаса прыняў за чыстую манету ўсе гэтыя несуразныя, хваравітыя выдумкі старой бабулькі-пенсіянеркі, слабаадукаванай і не маючай прафесійнай падрыхтоўкі загадчыцы фермы. Не высокага ж, прама скажам, інтэлекту гэты дырэктар. Ці не праўда? Не здолеў сам скеміць: дзе ў Мінску можна знайсці такога карэспандэнта, які б па першаму тэлефоннаму званку, ды не адзін, а ўтраіх, з маланкавай хуткасцю заправілі легкавушку і кінуліся ў падарожжа амаль за паўтысячы кіламетраў, каб паспець сфатаграфаваць недзе пад Хоцімскам, як там у саўгасе камерсанты рэжуць бычкоў для адпраўкі мяса ў братнюю Расію.

На другі дзень, калі ўжо тыя "карэспандэнты" ад'ехалі ў Мінск, дырэктар прыехаў на ферму і ў прысутнасці той самай Ленкі сказаў зяцю загадчыцы фермы, які таксама працуе тут даглядчыкам жывёлы: "Ідзі, Юра, скажы "яму" (гэта значыць, рэдактару "Беларускага Ўсходу"), што мы сёння ці заўтра будзем яшчэ біць бычка. Хай зноў выклікае фотакарэспандэнтаў. Шкада, што памёр Бургуцін (гэта муж загадчыцы фермы, якая фактычна толькі лічылася загадчыцай, а "кіраваў" тут нядаўна памерлы той Бургуцін, ляснік Забялышынскага лясніцтва), а то б тым карэспандэнтам пабілі б усе фотаапараты". І ўжо да Ленкі, з запалохваннем: "Так і перадай свайму цесцю (?)"

Вось якія "кадры" кіруюць вытворчасцю на Хоцімшчыне. А мо і яшчэ дзе? Дык дзе ж быць таму эканамічнаму росту, да якога імкнецца Прэзідэнт і павінны імкнуцца ўсе кадры? З эканамічнага крызісу краіна выйдзе толькі тады, калі вытворчасцю будуць кіраваць высокаадукаваныя, ад прыроды надзеленыя розумам, таленавітыя кадры, а не абмежаваныя людзі, накшталт упамянутых загадчыцы фермы і дырэктара саўгаса.

Васіль ДАЎГАЛЁЎ.

Таленты нашага краю

ЛІТАРАТУРНА-МАСТАЦКАЯ СТАРОНКА

Василий КОТИКОВ

Иди спать, милый...

ПЬЕСА

(Занавес открывается.)

Ночь. В комнате Он и Она. За столом сидит Он. На столе в левом углу стопка книг. На книгах стоит настольная лампа, ярко освещая стол. Свет падает на стол слева и спереди. Он сидит за столом, пишет. Сочиняет стихи. То он сидит несколько мгновений задумавшись, грызет зубами кончик шариковой ручки, то быстро начинает строчить на листе бумаги. Так рождаются стихи. Разные. Иной раз отличные, а порой и не очень...

Неподалеку — диван. На нем две высокие подушки. Возле стоит торшер. На диване полулежа. Она читает газету "Беларускі Усход".

Она: "Милый, ты скоро закончишь?"

Он (недовольно): "Чего тебе?"

Она: "Я хотела бы, чтобы ты почитал газету..."

Он: "Завтра почитаю. А сейчас не перебивай мне мысли... Вот, видишь, хорошая рифма на ум было пришла, а ты все сбила... Теперь попробуй, вспомни".

Она: "Что мне твоя рифма. Ты сейчас газету почитай".

Он: "Сейчас нет, не мешай. Раз уж со стихами не получилось, надо заметку написать про передовика-механизатора. В районку".

Она: "Дубина! Ты, ты возьми почитай "Колдовскую любовь". Кому нужна твоя заметка про механизатора Ивана, который на тележку больше завез навоза на поле, чем Гришка. Только тому Ивану и интересно, что ты его хвалишь. А ты почитай то, что тысячи людей с интересом и удовольствием читают".

Он: "Что тебе нужно?"

Она: "Послушайте, люди добрые, этот негодяй еще спрашивает... А то ты не знаешь, что мне нужно. Ты вот почитай "Колдовскую любовь"!

Он: "И это все?"

Она: "Пока — да".

Он: "Ну, хорошо, давай почитаю..."

(Он встает со стула, подходит к дивану, берет из рук жены газету, возвращается к столу, садится и читает про себя. Прочитал. Отодвигает в сторону).

Она (не глядя в его сторону): "Ну, как? Вот герой Витя. Ну и молодец. Вот это да!".

Он: "Хорошо, я прочитал".

Она: "Уже?"

Он: "Да, да.. все прочитал".

Она: "Ты что, робот?"

Он: "Ты же знаешь, кто я. Что за вопрос".

Она (с возмущением): "Ты издеваешься надо мной? Ты знаешь, как люди читают "Колдовскую любовь?" Вот вчера на работе Зина говорит, что они с Леней вместе читают эту повесть и делают то, что Наташа с Виктором".

Он: "Ну и дураки..."

Она: "Это ты дурак. Ты, ты, ты-ы! Испортил мне всю жизнь..."

Он: "Ну ладно, Таня, успокойся".

(Подходит к жене, обнимает ее за плечи).

Она: "Люди все, как люди, Читают "Колдовскую любовь" вместе... А я?"

Он: "Какая разница, как читать эту любовь, вместе или раздельно".

Она: "Большая разница, Вася, большая. Такая, как если один смеется, а другой дразнится — вот, какая разница".

Он: "Ну, к чему такие сравнения?"

Она: "А к тому, что у людей все по-людски, а у нас..."

Он: "А что у нас? У нас с тобой тоже все по-людски. Ты — читаешь, я — пишу".

Она: "А у нас то рубашка короткая, то штаны длинные — или наоборот".

(Встает с дивана, раздевается до трусиков и бюстгальтера и идет в постель).

Он: "Ну, ты спи, а я еще немного поработаю".

Она: "Идем спать разом, милый. Далась тебе твоя работа".

Он (откладывает в сторону бумаги на столе. Раздевается до трусов и — тоже в постель. Ложится рядом с женой, залезая под одеяло).

Она: "Ну что, так и уснем?"

Он: "Спокойной ночи..." (Поворачивается к жене спиной.

Она: "Ты прочитал тот отрывок из повести?"

Он: "Прочитал. А что?"

Она: "Как что? Как спали Витя с Наташей?"

Он: "А при чем тут они?"

Она: "Ах, как я завидую Наташе. Такой золотой муж у нее! Что он с ней вытворяет! А ты, какой у меня? Что ты за муж?"

Он: "Я плохой? Пьяница?"

Она: "Нет, с этим все в ажуре..."

Он: "Я курю? Провонял спальню табаком?"

Она: "Да нет, и с этим порядок..."

Он: "Я к другим женщинам хожу?"

Она: "Не ходишь, это правда..."

Он: "Не пью, не курю, к бабам не хожу... Что еще тебе от меня нужно?!"

Она: "Да лучше бы ты и пил, и курил, и к другим ходил..."

Он: "Ну, вам, бабам, и сам черт не угодит. Другая б хотела иметь такого мужа, как я — не пьющего, не курящего, по бабам не ходящего, на все руки мастера, работящего..."

Она: "Хватит тебе болтовней заниматься! Да кому такой нужен? Ни одна толковая женщина с таким жить не будет. Это только я, дура, столько лет с тобой мучаюсь. Я думала, что это и все так, как мы с тобой, живут — раз-два в месяц любовью занимаются, и то без всякой романтики. А вот почитала эту повесть, эту "Колдовскую любовь", и поняла, что я в жизни потеряла. А Зинка вон говорила, что они с Леней живут с радостью, с удовольствием. Нежатся, целуются. А теперь, говорит Зинка, читаем повесть и еще активнее любимся. Вот это жизнь! Мужчина должен быть не батраком в хате, а любовником!" (Таня сердито отвернулась лицом к стене, задом к мужу и замолчала...)

Он: "Ну все, будем спать".

Она: "Спи, кто тебе не дает. Это ж надо, под боком муж — и никакой радости. Как обидно! Никто меня даже не поцелует перед сном..."

Он: "Ну, давай поцелую, раз тебе так хочется. (Поворачивается к жене, обнимает ее, целует в щеку). Все, тишина, спим".

Он: "Что ты заладила — робот, робот..."

Она: "Еще хуже, чем робот. Робот и то, прочитав "Колдовскую любовь", воодушевился бы и не стерпел бы, уже давно был бы на мне..."

Он: "Таня, ты что, одурела?"

Она (упирается мужу в живот ногами и спихивает его с постели): "Болван, негодяй, растяпа, мямля, ты — размазня, ты, ты, ты... импотент. Эх, Наташа! Мне бы твоего Виктора хоть на одну ночь, чтобы я тоже испытала "Колдовскую любовь"... А то мой бумагомарака пишет стихи. Дурак!"

Он (молча берет покрывало, ложится на диван, укрывается): "От дуры слышу".

Она: "Ну, Вася, теперь я тебе и кушанья наготовлю и постираю..."

Он: "Таня, ну что ты подхватилась? Разве можно так делать?"

Она: "А тебе можно так делать?"

Он: "А что я такого сделал?"

Она: "В том и дело, что ты ничего не сделал. А должен бы сделать. Как в этой "Колдовской любви".

Он: "Ты меня уморила. Как ты не понимаешь, что это повесть. Автор может просто придумать. Это же не трудно. А ты за чистую монету это принимаешь..."

Она: "О нет уже, дудки. А Зина, что, придумывает, что они с Леней и без повести так делали?"

Он: "Ничего ты не понимаешь..."

Она: "Я понимать не хочу. Но коль у меня есть муж, он должен выполнять свои супружеские обязанности. А зачем мне он, как бревно под боком. Тебе ясно?"

Он: "Ясно, ясно..."

Она: "А коль ясно, то ходи сюда..."

Он: "Чтобы снова спихнула меня с кровати?"

Она (ласково): "Ну иди, дурачок мой синеглазенький. Обними, взасос поцелуй. Сними мне трусики, бюстгальтер. И все как у людей пусть будет... Ну иди, иди быстрей ко мне, милый..."

Он, наконец, распалившись, снимает трусы и быстренько к жене в постель.

(Занавес закрывается.)

Васіль ДАЎГАЛЁЎ

Марыля, каханне маё!

АПОВЕСЦЬ

(Працяг. Пачатак у N 6.)

— Тады, бабуля, добра, — усміхнуўся я, — хай беражэ мой спакой. І пачаў распакоўваць чамадан. Дастаў і развесіў па сценах карціны, эцюды, партрэты. Стосік кніг паклаў на стол, якi накасяк паставіў у кут пад ікону.

— Божухна родненькі-і... Зроду такіх трактарыстаў не бачыла. Карцінкі, праўда, нішто сабе. А кнігі гэтыя навошта? Які ж з цябе работнік будзе? Добраму трактарысту дыхнуць няма калі, не тое каб чытаць. Ды і навошта? Не граном жа ты. Табе што — сеў ды паехаў. Адно ведай — рычагі торгай.

— Нічога, Фамінічна, і папрацаваць паспеем, і пачытаць. Маякоўскі піша, што: "папаша хитр: землю попашет, попишет стихи"... Кніжкі і чытаць, і пісаць нікому не грэх.

— Ай-яй-яй... Харош ты, бачу, праведнік. Памылілася я, напэўна, не дзельны ты — языком чэшаш.., — прытворна-сурова гаварыла бабуля, а вочы смяяліся і ласкава іскрыліся.

— Ай-яй-яй, якая ж дурніца я! Госць з дарогі, а я... прабач мяне, Кастусёк, дазволь, я так зваць цябе буду, га? — затараторыла Фамінічна і хуценька накіравалася на кухню.

Пакуль яна там гатавала абед, я любаваўся парадкам у пакоі і думаў: якая мітуслівая бабулька. І цудоўная. Спадабалася чамусьці яна мне. Нейкае адчуванне настойліва гаварыла мне: добра табе тут будзе. На душы была патаемная радасць. Нейкі ўнутраны голас падказваў: прыйдзе да цябе шчасце ў гэтым доме.

АБЕД

— Кастусёк, унучак (я буду ўнучыкам цябе зваць, ты не крыўдзіся, прабач старую). Абед гатоў. Як у лістарані. Не пагрэбуй, — ветліва, з пачуццём гонару за сваё ўменне кухарыць, пазвала мяне Фамінічна. — Заходзь сюды. Кухня ў нас прасторная. Мы тут і харчуемся.

Я зайшоў на кухню. Духмяны пах, які даходзіў і ў мой пакой, тут асабліва моцна шыбануў у нос, выклікаў неймаверны апетыт, аж слінкі прыйшлося глытаць.

Якога баршчу я адведаў тады! А сапраўдныя сібірскія пельмені? І чаго ўжо я наогул з дзяцінства не спрабаваў — кавы з вяршкамі! А на дэсерт былі салёныя кавуны. Язык можна было праглынуць з такой ядою.

Ад душы дзякаваў я бабулю за абед, а яна ўся зіхацела ад радасці і гонару. Самалюбства яе бязмежна трыумфавала. І, заўважу, заслужана.

— Ідзі, прыляг, унучак, адпачні з дарогі. Заўтра ж, напэўна, і на работу? Ваш брыгадзір трактарны, Фогель, я яго ой як добра ведаю — адразу справу знойдзе, — павучальна сказала Фамінічна.

За вячэрай я ўжо ведаў ад гаварлівай бабулі, што ў яе ёсць унучка Марыля, што яна скончыла тэхнікум і ў тутэйшым калгасе аграномам працаваць будзе.

— Сіротка яна ў мяне, — жалобна расказвала Фамінічна, і крыштальныя слязінкі запоўнілі куточкі вачэй яе, — бацька на фронце загінуў, а маці вось ужо другі год, як памерла, сардэшная. Вось так хадзіла-хадзіла, легла спаць і навек заснула, аставіла нас з Марылькай, малую ды старую.

— А дзе ж Марыля зараз? — спытаўся.

— У Разань, унучак, да цёткі пагасціць паехала, — адказала бабуля.

Яна хуценька выйшла ў свой пакой і прынесла фотакартку ў прыгожай рамцы пад шклом.

— Вось яна, птушачка мая, — ласкава і пяшчотна гаварыла Фамінічна і ўся свяцілася, — адна яна ў мяне. Вось прыедзе і будзем жыць разам. Нікуды яе не адпушчу. Хай у сваім калгасе працуе.

— Дзяўчына — адрэзаная скіба, — пажартаваў я. — Выйдзе замуж і чалавек яе за трыдзевяць земляў, магчыма, завязе.

— Ніколі! Адна яна ў мяне. І так два з паловай гады жыла далёка. Хопіць. Яна самая лепшая дзяўчына. І хто ажэніцца на ёй — хай сам сюды прыязджае, тут і жыве, — бабуля далікатна пагладзіла рукой па шклу, пад якім фотаздымак унучкі.

— Суцяшэнне маё, — лепятала старая.

Я ўзяў з рук Фамінічны рамку з фоткай. На мяне глядзела з-пад шкла дзяўчына з косамі, якія звісалі з плеч на грудзі. У яе вачах было нешта загадкавае. Здавалася, што позірк яе накіраваны ў глыбіні будучыні, якую яна яскрава бачыць і гэтым вельмі задаволена. З ледзь прыадкрытых вуснаў выглядаў прыгожы шэраг зубоў. Бровы — паўмесяцамі, незвычайна прыгожыя, як намаляваныя. Нос крышачку кірпаты. Губы...

Фатограф быццам спецыяльна схапіў аб'ектывам усе самыя прыгожыя рысы твару, якія прама зачароўвалі, імкнуліся пазбавіць спакою любога хлопца, які ўбачыць гэтае фота. Я глядзеў... Штосьці незразумелае — ці то чыста хлапечае хваляванне, ці то невыразны ўспамін туманілі мой розум. Я і не заўважыў, што неадрыўна, з заміраннем сэрца разглядваю фота незнаёмай дзяўчыны. Штосьці мяне трывожыла. Незразумелае пачуццё перапоўніла ўсяго мяне. Фамінічна заўважыла румянец на маіх шчаках і, як чалавек з вопытам, зразумела яго паходжанне, таму сказала:

— Нечага табе чужы партрэт разглядваць. Глянь-ка ты, які лупасты, вочы як вылупіў. Спаць трэба. Заўтра на досвітку ў кантору на нарад пойдзеш...

З гэтымі словамі бабуля пайшла ў свой пакой, прыхапіўшы фота ў рамцы.

РОЗДУМ

Амаль усю ноч я не спаў. Не мог заснуць. Перабіраў у памяці ўсё пражытае. Гэта дзяўчыну я недзе бачыў. Але дзе? Рысы вельмі знаёмыя. І неяк асабліва дарагія. Чамусьці ўспомніліся вершы, якія я напісаў яшчэ ў дзяцінстве:

"Ты была яшчэ зусім дзяўчынка,
Я цябе ўбачыў ўпершыню,
Коскі твае чорныя..."

Коскі... Нават у гэтых косках, што на здымку, нешта знаёмае. Ці не... не тое. Хаця, між іншым... і звалі яе Марыля... Так, тая дзяўчынка з банцікамі ў косках... Не, ці мала Марыль на свеце з банцікамі ў косках? Ну, а ямачкі на шчаках каля рота? Як у той дзяўчынкі.

Не, гэта недарэчна... Гэта проста амаль немагчыма. А чаму амаль? Не — ні ў якім разе! Толькі чаму? Няўжо адмовіцца ад думкі аб магчымым шчасці? Э, ды я тут, здаецца, магу і з глузду з'ехаць... Давай-ка лепш засну...

А сон не прыходзіў. Заснуў, калі ўжо стала на зару брацца.

Разбудзіла мяне Фамінічна а сёмай гадзіне. Умыўся, паснедаў. А восьмай гадзіне быў ужо на нарадзе. Пацяклі брыгадныя будні.

Работы хапала. То на снегазатрыманне ездзім — "арэм" снег, то ў рэйсы на заімку за сенам, то дровы возім здалёк. Калі ж на трактары няма работы — калгасны брыгадзір паляводчай брыгады рады заўсёды "падкінуць" рабацёнку. І заўсёды дзякуе:

— Спасибо, Коста, што памагайт работайт. У нас калхоз работа многа, народ мала.

Сяджу іншы раз вечарам у вольны час за сталом і раздумваю: якія бязмежныя стэпы казахстанскія, якое багацце, колькі залатой пшаніцы, дзе цяпер былая цаліна! А колькі яшчэ яе асвоіць можна...

(Працяг будзе.)

Василий КОТИКОВ

И так бывает

Для Ивана водки пляшка
Много лучше, чем милашка.
Напоил Сережа Ваню,
И тот отдал ему Маню.

Держит „Рука"

Пень! Ни бэ ни мэ не знает,
А вот должность — занимает.
За что держат дурака?
У него в "верхах" "Рука"!

Январь

Стоят деревья в белых
Перчатках и шарфах,
Для закаленных, смелых
Морозы им — не страх.
И в белых шапках хаты,
Повсюду чистота.
Как свитые из ваты
Электропровода.

Совет депутату

Постой, товарищ депутат,
И выслушай меня, как брат,
Совет тебе дам, так и быть:
Глаза открыть, а рот закрыть!

Почему

Мои нервы не из стали,
Спрашиваю строго:
Почему конфеты стали
Дороже спиртного?

Косы

Всю область нужно обойти,
Чтоб девку с косой найти.
И весь район, чтоб в сенокос.
Кто на плече "девятку" нес.

Коля и Оля

На самокате Коля
Катается полдня.
К нему подходит Оля:
— Дай мне, проеду я.
Понятна просьба Коле,
Но он в ответ:
— Не дам, пока сегодня вволю
Не накатаюсь сам.
Увидел как-то Коля,
Свернув за поворот,
Как на скамейке Оля
Конфеточки сосет.
К ней быстро подбегает:
— Дай, Оля, мне конфет.
А Оля отвечает
Ему спокойно:
— Нет! Ты, Коля, можешь дуться,
Но только отойди.
Наемся, останутся,
Тогда и подходи.

Зоопарк в Кричеве.
Фото Валерия БЫСОВА.

Программа телевидения

ПОНЕДЕЛЬНИК, 19 февраля

БТ

6.30 Доброе утро, Беларусь!
7.00, 9.00, 11.00, 13.00, 15.00, 18.00, 23.35 Новости.
7.10 Доброе утро, Беларусь!
8.00 Резонанс.
9.15 Телебарометр.
9.30 Здоровье. Тележурнал.
10.00 «На крючке». 3-я серия.
11.15 «Все мои дети».
13.10 Детектив «Кольцо из Амстердама».
14.35 Уроки Н.Новожиловой.
15.10 Фильм - детям. «Маринка, Янка и тайна королевского замка».
16.30 «Маленькие животные». Док.фильм.
16.40 Теленавигатор.
17.00 «Все мои дети».
18.15 Политические диалоги.
18.40 Зона Икс.
18.55 Мелодрама «Любовь в лугах».
20.40 Колыбельная.
21.00 Панорама.
21.30 Права человека: взгляд в мир.
21.50 «На крючке». 3-я серия.
22.40 Стадион.
23.05 Планета «АРТ».
23.50 «СТВ-24 часа».

ОРТ

15.55 «Воздушные замки».
17.00, 23.20 Новости.
17.25 «Космический Вавилон». Спецрепортаж.
17.45 Жди меня.
18.40 Премьера. «Кто хочет стать миллионером?» Телеигра.
19.45 Спокойной ночи, малыши!
20.00 Время.
21.00 «Секретные материалы».
22.45 Анатолий Собчак. Жизнь на пределе.
23.35 Лыжный спорт. Чемпионат мира. Мужчины. 30 км.

РОССИЯ

7.00, 8.00, 10.00, 16.00, 19.00, 22.00 Вести.
7.30 Москва — Минск.
7.50 Местное время. «Дежурная часть».
8.15 Комедия «Бинго Бонго».
10.30 «Санта-Барбара».
16.30 «Том и Джерри». Мультсериал.
16.40 Вечерний экран. «Долгая дорога в дюнах».
18.00 Премьера. Телесериал. «Любовь. ru».
19.30 Местное время. Вести - Москва.
19.50 Большой репортаж РТР. Василий Антипов. «Время года — полярная ночь».
20.25 «Аншлаг» и К°.
21.35 Михаил Жванецкий. Простые вещи.
22.30 Местное время.
22.40 Подробности.
22.50 Дежурная часть.
23.00 «Из Ленинграда в Петербург». Вечер памяти Анатолия Собчака.
23.50 Спорт за неделю.

НТВ

5.00 «Сегодня утром».
7.55 «Улицы разбитых фонарей».
9.00, 11.00, 13.00, 15.00, 18.00, 21.00 Сегодня.
9.20 «Любовь и тайны Сансет Бич».
11.30 «Вчера в итогах».
12.45 «Куклы».
13.30 «Итого».
14.00 «Старый телевизор».
15.35 «Дог-шоу. Я и моя собака».
16.20 «Впрок».
16.40 «Футбольный клуб».
17.40 «Криминал».
18.25 Герой дня.
18.50 «Экстрадиция - III».
21.50 «Тушите свет».
22.00 «Рожденный вором».
23.05 «Час быка».
23.20 «Сегодня в полночь».
23.45 «Антропология».

КУЛЬТУРА

11.30, 13.30 Новости культуры.
11.40 «Живые и мертвые». Худ. фильм.
13.13 М.Плетнев. Детские песни.
13.45 Мультфильмы.
14.15 «Сферы».
15.00 Новости.
15.10 «Маленький бродяга».
15.35 Телеэнциклопедия.
15.50 Мультфильмы.
16.05 «Вижу цель!»

МОГИЛЕВ-1 НА БТ

12.00 Пунктир.
12.30 Видеодром.

МОГИЛЕВ-1

6.30 «Ранехонько!»
8.05 «Избранница».
8.55 «Верите ли вы в это?» Док. сериал.
9.20 «Пожарная академия». Комедия.
10.50 Мультфильмы.
16.30 «Инспектор Мартин Бек». Телесериал.
17.20 Мультфильм.
17.30 «Верите ли вы в это?» Док. сериал.
17.55 «Праздник в вашем доме».
19.00 Тяжелый день.
19.20 Телемагазин.
19.30 День области.
20.00 «Праздник в вашем доме».
21.00 «Пацаны». Худ. фильм.
22.35 «После полуночи». Триллер.

ВТОРНИК, 20 февраля

БТ

6.30 Доброе утро, Беларусь!
7.00, 9.00, 11.00, 13.00, 15.00, 18.00, 23.45 Новости.
7.10 Доброе утро, Беларусь!
8.05 «На крючке». 4-я серия.
9.10 «Тайный мир Алекс Мак».
9.40 «Маленькие животные». Док.фильм.
9.45 Стадион.
10.15 Док. сериал «Исторические расследования». Фильм «Трагедия Льва Толстого».
11.15 «Все мои дети». Сериал.
12.00 «Одиссея команды Кусто».
12.30 Криминальное досье.
13.10 Драма «Преступление и наказание». 1-я серия.
15.10 «Черный пират».
15.35 «Тайный мир Алекс Мак».
16.05 «5 х 5».
17.00 «Все мои дети». Сериал.
18.15 «Москва — Минск».
18.35 Зона Икс.
18.50 «Тетушка Даниэль». Худ. фильм.
20.40 Колыбельная.
21.00 Панорама.
21.30 Событие.
21.45 Спорт-курьер.
22.05 «На крючке». 4-я серия.
23.00 Ток-шоу «Будни».
0.00 «СТВ-24 часа».

ОРТ

8.00, 11.00, 14.00, 17.00, 23.10 Новости.
8.15 «Воздушные замки».
9.55 «Кто хочет стать миллионером?» Телеигра.
14.20 Царь горы.
14.45 ...До шестнадцати и старше.
15.20 «Покемон».
15.45 «Ералаш».
15.55 «Воздушные замки». Сериал.
17.25 «Все путешествия команды Кусто». «Атлантида. Поиск продолжается».
17.55 Как это было. «Маршал Жуков. Отставка». 1957 год.
18.40 «Что сказал покойник».
19.45 Спокойной ночи, малыши!
20.00 Время.
21.00 Алексей Булдаков в остросюжетном фильме «В двух шагах от «Рая».
22.40 Премьера. «Русский экстрим». Прыжок в бездну.
23.25 Мистический триллер «Полтергейст-3».

РОССИЯ

8.00, 10.00, 16.00, 19.00, 22.00 Вести.
8.15 «Откройте, милиция!» Док. сериал.
8.45 Фильм Юрия Ардашева «Слухи о любви».
9.25 «Русские горки».
10.30 «Санта-Барбара». Телесериал.
16.30 «Том и Джерри».
16.40 Вечерний экран. «Долгая дорога в дюнах».
18.00 Телесериал «Любовь. ru».
19.30 Местное время. Вести - Москва.
19.50 Боевик «Золото партии».
21.30 «Россия — начало». Премьера док. сериала. «Горящее лето».
22.30 Местное время.
22.40 Подробности.
22.50 Дежурная часть.
23.00 Мужчина и женщина. Элина Быстрицкая.
23.50 Лыжный спорт. Женщины 10 км. Двоеборье. Эстафета 4х5.

НТВ

5.00 «Сегодня утром».
7.55 «Экстрадиция - III».
9.00, 11.00, 13.00, 15.00, 18.00, 21.00 Сегодня.
9.20 «Любовь и тайны Сансет Бич».
11.25 Наше кино. «Не ходите, девки, замуж».
13.30 Криминал. «Чистосердечное признание».
14.00 «Старый телевизор».
15.30 Приключенческий сериал «Белые волки».
16.10 Сериал. «ТАСС уполномочен заявить...»
17.40 «Криминал».
18.25 Герой дня.
18.50 «Экстрадиция - III».
21.35 Футбол. Лига чемпионов «Манчестер Юнайтед» (Англия) — «Валенсия» (Испания).
0.00 «Сегодня в полночь».
0.25 «Дневник Лиги чемпионов по футболу».

КУЛЬТУРА

11.30, 13.30 Новости культуры.
11.40 «Живые и мертвые». Худ. фильм.
13.45 «Прометей». «Достать до неба». Мультфильмы.
14.15 Вместе с Фафалей.
14.30 Музыка во дворцах. Ансамбль старинной музыки «Московское барокко».
15.00 Новости.
15.10 Кино - детям. «Маленький бродяга».
15.35 Телеэнциклопедия.
15.50 Ретроспектива мультфильмов Романа Качанова. «Последний лепесток».
16.15 Дело житейское.

МОГИЛЕВ-1

6.30,7.10 «Ранехонько!»
7.00 Утренние новости.
8.05 «Избранница».
8.55 «Верите ли вы в это?» Док. сериал.
9.20 «Пацаны». Худ. фильм.
10.55 Мультфильмы.
16.30 «Инспектор Мартин Бек». Телесериал.
17.20 Мультфильм.
17.30 «Верите ли вы в это?» Док.сериал.
17.55 «Праздник в вашем доме».
19.00 Бобруйский вариант.
19.20 Телемагазин.
19.30 День области.
19.45 «Без протокола».
